ВЫБАР

ГАЗЕТА ДЭМАКРАТЫЧНЫХ ПЛЫНЯЎ ПРЫДЗВІНСКА- ПРЫДНЯПРОЎСКАГА КРАЮ

№ 16(22) 26 жніўня 1992 г. Цана 1 рубель

ЗАЯВА

сойма БНФ

УНУТРЫПАЛІТЫЧНАЕ СТАНОВІШЧА І ЛЁС НАШАЙ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ

Вярхоўны Савет Беларусі сваімі паўгадавымі «канікуламі» дамогся адкрытае народнае непавагі і знік з палітычнага жыцця. Экскамуністычная большасць Вярхоўнага Савета зраслася з Саўмінам, і ў Беларусі безраздзельна гаспадарыць ранейшая партыйная алігархія.

Кіраўніцтва ўрада больш не робіць выгляду, што дбае пра лёс Беларусі і яе незалежнасці. Не заключана ніводнага пагаднення, якое б дазваляла Беларусі мець карысць з унікальнага выгоднага геаграфічнага становішча. «Эканамічная палітыка», заснаваная на вонкавым перайманні чужых эксперыментаў пры захаванні манапалізму, правальваецца. Расце злачыннасць і бушуюць пажары—урад бяздзейны і бездапаможны. Авантура з павышэннем цэнаў на мяса, якім забіты дзяржаўныя халадзільнікі, абурыла літаральна ўсіх жыхароў нашай краіны. Савет Міністраў жа ў першую чаргу займаецца наменклатурнаю прыватызацыяй і стварае прыярытэтныя ўмовы для кампрадорскага прадпрымальніцтва, якім заняліся былыя камуністычныя апаратчыкі. Народнае падтрымкі ў Беларусі ўрад не мае і ў страху перад рэферэндумам шукае апоры ў чужой дзяржавы, якая будзе падтрымліваць любы тутэйшы рэжым—абы трымаць тут сваё войска, кантраляваць нашу эканоміку і мець калідор на Захад.

20 ліпеня ў Маскве падпісаны расейска-беларускія дакументы, якія маюць вялікае палітычнае значэнне. Падпісаны без ніякіх папярэдніх парламенцкіх і грамадскіх абмеркаванняў, частка дакументаў падпісана нават без даручэння на тое Вярхоўнага Савета. Шматлікія палажэнні маскоўскіх пагадненняў скіраваныя супраць незалежнасці, супраць эканамічных інтарэсаў Беларусі і кожнага з нас.

Гэта—захаванне адзінае рублёвае прасторы, якая ўжо прывяла да «лібералізацыі» цэнаў, абясцэньвання ўкладаў, страты абаротных сродкаў прадпрыемстваў. Прыватызацыя ж пры адсутнасці ўласнай валюты прывядзе да канчатковага разрабавання нацыянальнага багацця—усё будзе скуплена за прывезеныя рублі.

У пагадненнях Беларусь адмаўляецца ад прынятай ва ўсім свеце платы за транспартны транзіт. Велізарныя патокі транспарту з усходу рушаць праз нашу тэрыторыю, наносячы ёй экалагічную шкоду, але Беларусь не атрымлівае ні рубля кампенсацыі і губляе мільярды.

Пагадненні замацоўваюць манапольную сыравінную залежнасць Беларусі ад Расеі. «Сумеснае абсталяванне» мяжы з балтыйскімі краінамі—гэта геапалітычны выбар на карысць Расеі. Мяжа з ёю застаецца «празрыстай», у той час калі, прыкладам, з Літвой—«жорсткаю» і фактычна падкантрольнаю Расеі. Мы—за добразычлівыя і ўзаемавыгадныя сувязі з усімі суседнімі дзяржавамі, за «празрыстасць» усіх межаў Беларусі для чалавечых кантактаў, для сумленнага гандлю, для лучнасці з супляменнікамі. Але мы—за мяжу, падкантрольную толькі Беларусі, за мяжу, праз якую да нас не праедзе злачынца, махляр, тэрарыст.

Асаблівую небяспеку для будучыні Беларусі тояць маскоўскія вайсковыя пагадненні. Паводле іх, Беларусь—прэтэндуючы на нейтральны статус—утрымлівае на сваёй тэрыторыі бліжэйшыя 7 гадоў вялікія вайсковыя сілы іншай дзяржавы і ў асноўным забяспечвае іх, аддае Расеі пад кантроль сваю вайсковую прамысловасць. Гэта—запрашэнне на акупацыю нашай краіны, і калі прэзідыум ВС спрабуе зараз пратэставаць супраць падзелу флоту паміж Расеяй і Украінай пры ігнараванні інтарэсаў Беларусі, гэта—маханне кулакамі ўслед цягніку, які ўрад пакіраваў па дарозе дзяржаўнай здрады.

Паміж Расеяй і шэрагам былых рэспублік СССР склаліся напружаныя адносіны. Заключаныя пагадненні не толькі прывязваюць Беларусь да знешняй палітыкі Расеі, але ўтвараюць геапалітычную пагрозу іншым нашым суседзям. Такая міжнародная палітыка цалкам супярэчыць Дэкларацыі аб суверэнітэце і непрымальная для дэмакратычных сілаў Беларусі.

Урад Беларусі, не чакаючы ратыфікацыі асноўнае вайсковае дамовы з Расеяй Вярхоўным Саветам, заключыў дадатковыя пагадненні, якія дзейнічаюць з моманту падпісання. Сойм катэгарычна пратэстуе супраць такога грубага парушэння міжнародных нормаў і беларускага заканадаўства. Сойм папярэджвае Вярхоўны Савет і ўрад аб недапушчэнні ўвядзення ў дзеянне гэтых пагадненняў да разгляду пытання на сесіі Вярхоўнага Савета.

Былая партнаменклатура ў Беларусі забяспечвае свой наступ інфармацыйнаю палітыкай: манапалізацыяй прэсы ў руках Саўміна, пераследам іншадумства на тэлебачанні. Яна спадзяецца чарговы раз падмануць народ. Але зняменне пасля ўвядзення псеўдарынкавай эканомікі ў людзей праходзіць, ізноў расце палітычная актыўнасць. Больш і больш людзей прыходзіць да пераканання, што наш паратунак—нацыянальная кансалідацыя на грунце незалежнасці Беларусі і дэмакратыі. З'яднаўшыся, мы выйдзем на рэферэндум, каб нарэшце адкрыць дарогу вольным выбарам і стаць на цяжкі, але выратавальны шлях пабудовы незалежнасці, здаровай эканомікі, дэмакратычных рэформаў.

Сустрэча з Шымонам Перасам

У час свайго знаходжання ў Рэспубліцы Беларусь Міністр замежных спраў Ізраіля Шымон Перас наведаў майстэрню нашага земляка Заіра Азгура.

Міністр замежных спраў Рэспублікі Беларусь Пятро Краўчанка прадставіў замежнаму госцю вядомых дзеячоў літаратуры і мастацтва. На сустрэчы, якая прайшла ў сяброўскай атмасферы ў рэзідэнцыі «Заслаўе—І» Рыгор Барадулін расказаў аб сваёй рабоце над перакладамі яўрэйскага паэта Хайма Бяліка, а Давід Сімановіч—аб Шагалаўскіх днях у Віцебску, аб тым, як увекавечылі памяць вялікага мастака, яго першага настаўніка Юрыя Пэна.

Нашы землякі-паэты падарылі Шымону Перасу сувенірнае выданне «Марк Шагал. Паэзія», у якім змешчаны пераклады вершаў мастака, зробленыя Рыгорам Барадуліным і Давідам Сімановічам, а таксама спецыяльны выпуск газеты «Віцьбічы» «Шагаловские дни в Витебске», іншыя сувеніры, прысвечаныя жыццю і творчасці Марка Шагала.

На сустрэчы Рыгор Барадулін Давід Сімановіч, Анатоль Вярцінскі ўнеслі шэраг цікавых прапаноў па ўмацаванню і пашырэнню культурных сувязей Рэспублікі Беларусь і Ізраіля.

А. СВАТ.

Сьвяткаваньне ўгодкаў 25-га Сакавіка ў Сіднэі, Аўстралія

74-я Ўгодкі Абвяшчэньня Незалежнасьці Беларусі Актам 25-га Сакавіка, 1918 г., былі афіцыйна абыходжаныя беларускай грамадой г. Сыднэя ў нядзелю, 29-га сакавіка... З самай раніцы беларусы з усіх куткоў Сыднэйскай мэтраполіі пачалі накіроўвацца ў Праваслаўную Царкву Амэрыканскай Юрысдыкцыі ў прыгарадзе Бэнкстаўн, дзе Айцец Він'ямін адслужыў адмысловы малебен за Беларускі народ і пажадаў яму найлепшых посьпехаў у канчатковым асягненьні ідэялаў Незалежнасьці...

Сьвяточная Акадэмія пачалася а 1-ай гадз. дня ў Беларускім Доме ў Фэйрфілдзе, які быў перапоўнены прысутнымі і каторыя з належнай увагай выслухалі расказ ды ўспаміны Сп. С. Шаўцова аб жыцьці і змаганьні Беларускага народу, пачынаючы з 20-х гадоў, якія ён сам перажываў ды быў сьведкам варожых плянаў зьнішчэньня беларускага народу... Нягледзячы на пажылыя гады і вялікую адлегласьць часу, Сп. С. Шаўцоў з надзвычайнай яркасьцю зрабіў агляд тых змагарных падзеяў, якія назаўсёды застануцца вельмі важнай часткай гісторыі Беларусі і якія давялі да адбываючагася ў сучасны мамэнт аднаўленьня Незалежнасьці Беларусі... Прысутныя падзякавалі Сп. С. Шаўцову доўгатрывалымі воплескамі!

Пасьля адчытаньня надасланых прывітаньняў Сп. Міхасём Лужынскім і Сп. Міхасём Зуям, афіцыйная частка Акадэміі закончылася супольным адспяваньнем Беларускага Нацыянальнага Гімну «Мы Выйдзем Шчыльными Радамі» і ўсе бяз вынятку былі перакананыя, што ў скорай будучыні ўвесь беларускі народ будзе пачынаць свой Нацыянальны Гімн «Мы **Выйшлі** Шчыльнымі Радамі»!!!

Сяброўкі Жаночага Камітэту ізноў падгатавалі надзвычайны абед, які быў благаслаўлены Айцом Ігарам і які працягваўся ў прыемным, сьвяточным настроі да позьняга вечара...

Алесь АЛЕХНІК,
гэнэральны сакратар Беларускага аб'еднаньня Аўстраліі.

Ствараюцца ініцыятыўныя групы

У гарадах і раёнах Віцебскай вобласці праводзіцца запіс грамадзянаў, што жадаюць удзельнічаць у працы ініцыятыўнай групы па правядзенню рэферэндуму.

Сябры ініцыятыўнай групы будуць прыцягвацца да працы ў якасці назіральнікаў на выбарчыя ўчасткі ў дзень правядзення галасавання.

Рэгістрацыю ўсіх жадаючых праводзяць мяйсцовыя прадстаўнікі дэмакратычных партыяў ды рухаў.

Грамадзяне могуць непасрэдна звяртацца з аналагічнымі пісьмовымі просьбамі ў рэдакцыю газеты «Выбар» (адрас рэдакцыі і тэлефоны для даведак на бачыне 8).

Прэс-бюро Віцебскага гарадскога клуба выбаршчыкаў «За дэмакратычныя выбары».

Нам пішуць з замежжа

Слушную ацэнку даў В. Быкаў

Я атрымліваю Вашую газэту рэгулярна і знаходжу ў ёй цікавыя выказваньні аўтараў. Слушную ацэнку даў аб «Выбары» В. Быкаў.


Вашыя праблемы моцна розьняцца ад нашых. Вы думаеце аб будучыні і для яе працуеце. Мы таксама думаем аб будучыні Беларусі, але асабіста ў нас будучыні няма. Мы ўжо тут старыя і многа хто, асабліва ў гэтым годзе, памёр з нашых людзей. Але тыя, што некалі актыўна працавалі для дабра Беларусі, яшчэ працуюць і ўсё залежыць як доўга дазволіць ім здароўе працаваць. Людзі, якія выдаюць «Голас Часу», маюць ужо на карку 70-т, або як рукою дастаць да 70-кі.

Шчыра дзякую Вам за памяць пра наш часапіс і жадаю Вам і Вашым супрацоўнікам посьпехаў.

З пашанай,

Юры ВЕСЯЛКОЎСКІ
(рэдактар беларускамоўнага брытанскага часопіса «Голас Часу»—Рэд.).

Фэст з ваярскімі спевамі



Днямі на Віцебшчыне і этнічна беларускіх землях Невельшчыны вандравала група маладзёнаў з «Выбранецкіх шыхтоў».

Хлопцы і дзяўчаты з гэтай нацыянальна-адраджэнскай арганізацыі збіралі фальклор, вывучалі гаворку паўднёвае Пскоўшчыны, грамадскую думку жыхароў гэтага краю. Па вяртанні ў Рэспубліку Беларусь выбранцы зладзілі ля возера Лосвіда фэст з ваярскімі спевамі і рытуальнымі паганскімі скокамі, гульнямі і танцамі.

Ю. СЯРГЕЕЎ.



Беларусь будзе набываць моц

ІНТЭРВ'Ю З ЛІДЭРАМ ВІЦЕБСКАЙ РАДЫ БНФ МІХАСЁМ ПАЎЛАВЫМ У СУВЯЗІ З ПЕРШАЙ ГАДАВІНАЙ ЖНІВЕНЬСКІХ ПАДЗЕЙ

«ВЫБАР»: Як Вы ацэньваеце шлях, пройдзены Беларуссю за год пасля векапомнага жніўня!

АДКАЗ: Незалежнасць, па сутнасці, звалілася на нас, як снег на галаву. Увесь гэты год наш Вярхоўны Савет, урад пляліся ў хвасце за сваімі суседзямі—Расіяй, Украінай, Прыбалтыкай. Гэта тлумачыцца тым, што ўсе ўладныя структуры на Беларусі, ад самага нізу да самага верху застаюцца камуністычнымі па сваёй сутнасці. Чыноўнікі, што сядзяць ва ўсіх гэтых структурах, не маюць сваёй свядомасці, дакладней, у іх свядомасць зомбі: яны могуць толькі пераймаць чужы вопыт, слепа капіраваць яго, а ўласнай пазіцыі не маюць. І ўсё ж такі ёсць і станоўчыя здабыткі. Дэкларацыі аб незалежнасці нададзены канстытуцыйны статус, у якасці дзяржаўных зацверджаны гістарычныя сімвалы Беларусі—бел-чырвона-белы сцяг і герб «Пагоня». У розных дзяржавах свету Беларусь ужо не атаясамліваюць з «Северо-западным краем», а ўважаюць за незалежную краіну: ведаю гэта па асабістаму вопыту сваіх сустрэч з замежнымі гасцямі. За апошні год пра Беларусь усё больш і больш даведваюцца ў свеце як пра самастойную дзяржаву.

І ўсё ж суверэнітэт наш—у асноўным толькі на паперы. Пра гэта сведчаць і апошнія крокі ўрада, які здрадзіў Беларусі, падпісаўшы вайсковыя пагадненні з Расеяй. Ацэнка гэтай здрады ўрада дадзена ў заяве Сойма БНФ, якая апублікавана, таму я не буду паўтарацца. Каб незалежнасць наша адбылася на справе, трэба будзіць нацыянальную самасвядомасць людзей. І калі з'явіліся рокеры, што ездзяць з бел-чырвона-белымі сцяжкамі, калі з'явіліся нашы, беларускія, рок-гурты—гэта сведчыць, што нацыянальная самасвядомасць, хоць паволі, марудна, але абуджаецца. Аснова нацыянальнага адраджэння—у школе. На вялікі жаль, наша настаўніцтва (асабліва беларускія мовазнаўцы, якія, здавалася б, павінны адыграваць важнейшую ролю ў гэтым працэсе), яшчэ не абудзілася, займае ў сваёй большасці вельмі пасіўную пазіцыю, і ў гэтым—вялікая бяда беларускага народа.

«ВЫБАР»: Ваш прагноз на бліжэйшае паўгоддзе—як будзе складвацца сітуацыя!

АДКАЗ: Даваць прагноз у наш імклівы час—справа небяспечная, бо сітуацыя змяняецца хутка. Пры гэтым ацэньваць сітуацыю трэба навукова, гістарычна. Таму прадказаць, што адбудзецца на Беларусі ў бліжэйшы час, даволі складана, і справа гэта няўдзячная. І ўсё ж можна прадбачыць, што Беларусь у бліжэйшыя месяцы будзе набываць моц, паступова пачуццё неабходнасці стварэння паўнацэннага нацыянальнага жыцця будзе захопліваць усё большую частку індывідаў асноўнага этнасу і прадстаўнікоў іншых народаў Беларусі. Камуністычная свядомасць, ці дакладней, посттаталітарная ментальнасць «гома саветыкус» будзе працягваць дэманстраваць сваю няслушнасць. На гэтым фоне магчымы адхіленні як у «плюсавы», так і ў «мінусавы» бок.

«ВЫБАР»: Што мае рабіць канкрэтнае Віцебская суполка БНФ у бліжэйшы час!

АДКАЗ: Першае. Стварыць камітэт грамадскага самакіравання ў адным з мікраранаў Віцебска. Другое. Дамагчыся змены назвы вуліцы, якая цяпер носіць імя крывавага душыцеля паўстання 1794 года на Беларусі пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі—імя Суворава. Суворaў—крывавы кат, ён бязлітасна знішчаў лепшых змагароў за волю і незалежнасць нашай Бацькаўшчыны. Тое, што яго імем названы ў нас тысячы ўстаноў, калгасы, саўгасы, вуліцы—непрыхаваны здзек з беларускага народа. Мы імкнемся дамагчыся і дэмантажу помніка гэтаму душагубу, які знаходзіцца ля ваенкамата на гэтай вуліцы. Трэцяе. Мы імкнемся, каб было прынята канцэптуальна абгрунтаванае рашэнне па аднаўленню гістарычнай забудовы прадмесця Задзвінне ў Віцебску. І, нарэшце, чацвёртае—падрыхтоўка да рэферэндуму, што ўключае пашырэнне друкарскай базы, набыццё абсталявання, фарбаў, паперы для адозваў і г. д. У сувязі з набліжэннем рэферэндуму—актывізацыя работы ўсёй суполкі, падключэнне да гэтай дзейнасці як мага большай колькасці віцьблян. Ініцыятыўная група па падрыхтоўцы і правядзенню рэферэндуму будзе працаваць да самага апошняга тэрміну, па сутнасці, да самага дня рэферэндуму. Мы спадзяёмся падключыць да гэтай ініцыятыўнай групы ўсіх, хто можа канкрэтнымі справамі дапамагчы ў правядзенні рэферэндуму. Так што работа па адраджэнню нашай Бацькаўшчыны будзе няўхільна працягвацца.

А. БУКАЧОЎ.

Справка для читателей

ОДПБ. Несколько слов о себе

3—4 ноября 1990 г. состоялся учредительный съезд Объединенной демократической партии Белоруссии (ОДПБ), в которую вошли представители различных демократических групп и движений из г. Минска и всех областей Республики, осознавшие, что только объединение усилий и организованность демократического движения создадут условия для построения правового государства и гражданского общества. 19 марта 1991 года ОДПБ была официально зарегистрирована в министерстве юстиции БССР.

ОДПБ—партия общедемократической направленности.

Для нас ЛИЧНОСТЬ и СЕМЬЯ являются высшими ценностями и составляют основу общественной жизни. Интересы социально-классовых и национальных групп, а также и государства, должны стоять по своей значимости ниже прав и свобод ЧЕЛОВЕКА. Мы выступаем за право КАЖДОГО на СВОБОДУ выбора в экономике, политике, мировоззрении, культуре. Государство должно служить гарантом этого выбора и не вмешиваться в частную жизнь граждан.

Наша партия не собирается ничего перераспределять. Мы уверены, что освободив человека, раскрепостив его энергию и инициативу, можно создать условия, при которых его интеллект и труд будут оценены в полной мере. КАЖДЫЙ должен решать свою судьбу САМ! Мы считаем, что на помощь и защиту государства могут рассчитывать лишь те, кто не может по объективным причинам работать: дети, инвалиды, престарелые, безработные и др.

Выступая за создание правового государства и гражданского общества, ОДПБ как партия парламентского типа намерена добиваться этого НЕНАСИЛЬСТВЕННЫМ путем и в рамках ЗАКОНА. Мы против монополии и диктата любой партии, класса, социальной или национальной группы. Мы—за свободную борьбу ИДЕЙ, но не людей.

ОДПБ выступает за независимую Беларусь в Содружестве суверенных государств и считает, что источником и гарантом подлинного суверенитета может быть ТОЛЬКО СВОБОДНЫЙ ЧЕЛОВЕК!

Мы призываем к сотрудничеству ВСЕХ, кому дорога судьба нашей многострадальной Беларуси, будущее наши детей и внуков!

ПИШИТЕ, ЗВОНИТЕ:
г. Минск, Плиско Михаил Казимирович т. 56-11-21; 220094, Минск-94, а/я 299; 220101, Минск-101, а/я 329; 220060, Минск-60, а/я 74.
г. Витебск: Залесская Елена Васильевна т. 5-04-03;
г. Витебск: Жураковский Валерий Романович т. 1-26-15; 210015, Витебск, а/я 38.

Ананімкі на слупах

ПА ЧЫМ СУМУЕЦЕ, «ТАВАРЫШЫ»?

Ох, і падпольшчыкі нашыя камуністы! Сям-там панавешвалі цыдулак з заклікамі супроць незалежнасці напярэдадні свята 27 ліпеня. Дык каб хаця нешта новае было, а то зноў ці то дурня ўдаюць, ці то яны ад нараджэння такія.

Вось толькі паслухайце: «От кого независимость? И кого?» Ну ведама ж ад чаго (а не «ад каго»). Ад імперыі, ад «цэнтра». Народаў, сябры мае.

«Кто вредил тот и ныне у власти», «Наше молчание на пользу ворам, предателям народа и... врагам».

Няма нічога новага пад месяцам. Было ўжо гэта, было. Таварыш Сталін ухваліў бы, бо і лексіка тая ж, і злосць партыйная ў старых традыцыях.

«Кто такие Ельцин, Шушкевич, Кравчук, Наумчик, Позньяк, Гайдар,...?» (так у тэксце—Ю. Т.).

Кахаленькія-родненькія, не быў Пазьняк у вашай партыі. А Шушкевіч быў. Дык кім? Радавым (па вашай тэрміналогіі) камуністам. І, дарэчы, пра якога Навумчыка гаворка йдзе?

Не новы сум у «таварышаў» і па камуністычнай сімволіцы, па імперыі і аб «языке». Пры вашай сімволіцы сцягі рэспублік не неслі адбітку нацыянальнага, а толькі ідэалогію і, у лепшым выпадку, нейкія геаграфічныя адзнакі краін.

Зрэшты, большасць вашых сцяжкоў прыдумана паводле савецкага шаблону ўсяго некалькі дзесяцігоддзяў таму, напрыклад «бээсэсэраўскі» толькі ў канцы 50-х і без абмеркавання. А ўсім імперыям, штучна сабраным, наканаваны развал. Прыгадаем Рымскую і Візантыйскую, Асманскую і «трэці рэйх», Брытанскую і Югаславію... І, зрэшты, Расійская імперыя пачала развальвацца шчэ ў 1867, калі на ўсходзе рускія сказалі сабе: «Досыць» і прадалі Аляску. Прыгадаем 1917—1925 гады. Ці не было на тэрыторыі былой імперыі незалежных Фінляндыі й Польшчы, балтыйскіх краін, БНР і УНР, Тану-Тувінскай Народнай Рэспублікі і ДУР..? Так што не дэмакраты развалілі «великую страну», а імкненне да свабоды народаў і немагчымасць імперыялістаў утрымліваць захопленае..

І на заканчэнне. Пішыце, даражэнькія, са знакамі прыпынку, каб хаця б трошкі вашыя думкі лагічнымі былі. І падпісвайцеся—бо народ павінен ведаць блазнаў у твар.

Ю. ТУТЭЙШЫ.

БУДУЦЬ СУПОЛЬНА ВЫСТУПАЦЬ

У Менску Выканкамам Цэнтральнай Рады Беларускай сацыял-дэмакратычнай Грамады і Прэзідыумам прафесійных саюзаў Беларусі прынята пагадненне аб супрацоўніцтве і зроблена сумесная заява, у якой, у прыватнасці, гаворыцца: «... сацыял-дэмакраты і Федэрацыя прафесійных саюзаў Беларусі будуць супольна выступаць у абарону інтарэсаў працоўных, у абарону эканамічнай, сацыяльнай і палітычнай дэмакратыі, сцвярджаць каштоўнасць працы як самага важнага вытворчага рэсурсу. Мы будзем супольна выступаць за салідарнае грамадства, заснаванае на прынцыпах свабоды, роўнасці, дэмакратыі, сацыяльнай справядлівасці і прыярытэту права. Дзеля гэтага мы заключаем пагадненне аб супрацоўніцтве БСДГ і ФПБ у галіне дзяржаўнага і культурнага будаўніцтва, у галіне эканамічнай і сацыяльнай палітыкі. Усе нашыя дзеянні будуць накіраваныя на паляпшэнне дабрабыту народа, на забеспячэнне сацыяльнай, эканамічнай і палітычнай стабільнасці нашай краіны—Беларусі».

Улічваючы блізкасць пазіцый Грамада й прафсаюзы будуць супольна выступаць з заканадаўчымі ініцыятывамі ў рэспубліканскім парламенце. У бліжэйшую часіну гэтыя арганізацыі плануюць прадставіць на разгляд ВС шэраг даволі важных законапраектаў, якія датычаць інтарэсаў працаўнікоў. У перспектыве магчымае нават супрацоўніцтва грамадоўцаў ды Федэрацыі падчас выбарчае кампаніі ў парламент Беларусі.

Нягледзячы на тое, што пагадненне БСДГ і ФПБ афіцыйна не накіравана супроць якойсьці трэцяй арганізацыі, па ўсяму бачна, што прафсаюзы пачынаюць шукаць сувязі з апазіцыяй, абмінаючы былых сваіх саюзнікаў—камуністаў у цяперашнім абліччы ПКБ і ейных хаўруснікаў. Мусіць, кіраўніцтва прафсаюзаў нарэшце зразумела, што ідэі дэмакратыі бліжэй да інтарэсаў радавых сяброў ФПБ.

М. КАЛІНОЎСКІ.

ПЕРЕЕЗД ИВАНА ИВАНОВИЧА,

или О том, как народный депутат Республики Беларусь согласно своей предвыборной программы ратовал за социальную справедливость

Не знаю, плакали ли от радости представители различных слоев населения Лиозненского района после победы на выборах в Верховный Совет республики кандидата в народные депутаты первого секретаря райкома КПБ Ивана Авина.

Ну, кто бы из угнетаемых чиновниками в нашей тогда еще не бывшей советской стране, не пожал бы горячо руку Ивану Ивановичу только за такой пункт его предвыборной программы. «Ставлю перед собой цель добиваться социальной справедливости между ответственными лицами и рядовыми тружениками».

Понимаете, сам высший по должности в районе партаппаратчик поставил перед собой удивительную цель привить ощущение правды-матки в одинаковой мере и начальникам, и простым работягам в масштабе республики.

Будущий депутат при этом даже волновался. Иван Авин письменно в той же самой программе так и заявил: «Меня волнует несовершенство системы нашего законодательства».

Через некоторое время после прошедших выборов заперспективила возможность переезда на работу из Лиозно в город Минск. Засветилась надежда в связи с этим получить квартиру в столице.

Для человека, пообещавшего народу сделать равными начальников и обыкновенный люд в пользовании социальными благами, вопрос по жилью должен был решаться просто: сдал государству свой лиозненский особняк по улице Садовой, 3 и получил в Минске соответственно на свою семью квартиру. В Лиозно, в доме Авина (помимо его самого и жены) проживали невестка с внучкой. Сын в 1988 году был выписан в город Москву на учебу до 1993 года.

Так бы наверняка поступил какой-либо рядовой колхозник или другой представитель трудовой Лиозненщины, которую немало лет вел к светлому будущему товарищ Авин.

Мог бы быть и другой вариант, коль народному депутату предстояло получить квартиру в Минске. Невестка с внучкой не захотели бы переезжать в столицу. В таком бы случае Иван Иванович согласно жилищному законодательству получил бы с женой на двоих в Минске квартиру, разумеется, площадью меньше просторного лиозненского дома.

Что же произошло на самом деле? Сверял ли Иван Иванович свои действия по своей предвыборной программе народного депутата Республики Беларусь, я не знаю. Авин поступает неожиданным образом. Он расширяет состав своей семьи. Прописывает к себе в Лиозно свою мать Викторию Августиновну, 1919 года рождения, хотя она имеет на праве личной собственности дом в деревне Ярево Поставского района. Видел я этот дом собственными глазами, руками стены ощупывал. И удивлялся столь решительному поступку Ивана Ивановича, который так щедро обещал трудящимся бороться за социальную справедливость, если его выберут народным депутатом Республики Беларусь.

Удивляйтесь, сколько хотите, а передо мной справка, подписанная начальником паспортного стола Лиозненского РОВД. В ней черным по белому сказано, что Авина В. А., мать, прописана по адресу: улица Садовая, № 3, 19.11.1990 года по письменному указанию председателя Лиозненского райисполкома П. Блохина. Я не выдержал и спросил у председателя исполкома, а что его заставило нарушить наше законодательство, которое и без того, согласно утверждению Авина, так несовершенно. Председатель исполкома мне откровенно признался, что не выдержал тогда натиска Ивана Ивановича, пошел на нарушение.

Но самое интересное дальше. Престарелая женщина была выписана 2 декабря 1990 года из Лиозно в город Минск, то есть спустя две недели после прописки в райцентре. Что случилось? К чему такая спешка? Может быть не там стала, не то сказала? Но здесь другой случай. Именно в этот день выписался из Лиозно в город Минск Иван Иванович со своей супругой Валентиной Васильевной.

Я посмею предположить, что он выехал в столицу не на пустое место. Минская квартира маячила на горизонте. Притом желанная по размерам жилплощади: теперь же у Авина семья состояла из трех человек! Правда, на 4-х комнатную квартиру пока не дотягивала. И, как я предполагаю, Иван Иванович ковал железо, пока оно было горячо. Он выписывает из Москвы сына Владислава (или Владислав сам выписывается), хотя парень должен находиться на учебе до 1993 года. Наконец-то у народного депутата семья была создана из 4-х человек, на которую он и получил 4-комнатную квартиру жилой площадью 48,52 м² по улице «Известий» в городе Минске. Причем двое (Авин с женой) фактически проживают на этой жилплощади, а сын и мать значатся прописанными и на них начисляется квартплата.

Если это не так, уважаемый Иван Иванович, то ваша престарелая мать Виктория Августиновна (пусть она извинит меня за упоминание лишний раз ее доброго имени), выходит, проживает в Минске (хотя односельчане утверждают, что в Ярево) и регулярно, в таком-то возрасте, ездит на Поставщину (не летает же на ковре-самолете) и ставит свою подпись в пенсионном листке, а также уплачивает все налоги за свой дом.

Казалось бы, дело сделано с 4-комнатной квартирой в городе Минске. Но это для тех, кто не знает бывшего первого секретаря Лиозненского райкома партии. Я не хочу предполагать, как он мыслил далее. Были ли у его какие-либо планы относительно того, чтобы приблизить к себе внучку? Как известно, невестка с ребенком оставалась проживать в просторном доме (62 кв. м) на улице Садовой, № 3 в Лиозно на расстоянии от Минска в три сотни километров.

И вот совсем недавно, 23 июля с. г., Лиозненский райисполком разрешил обменять ее жилплощадь (бывший дом И. Авина) в райцентре на 4-комнатную квартиру (52,8 кв. м) в Минске. И невестка с внучкой переехали в столицу. Махала ли она ручкой жителям Лиозно, этого я тоже не знаю.

Итак, подведем итоги. У Авина и его близких теперь две 4-комнатные квартиры в Минске и жилой дом в Поставском районе. Молодцы! Молодцы! Хорошо устроились. Улучшили свои жилищные условия гораздо раньше обещанного 2000 года.

Не раз мне, как телезрителю, приходилось видеть крупным планом Ивана Авина, участвующего в работе Верховного Совета республики. Мне не известно, насколько он там эффективно борется за утверждение социальной справедливости, что об этом рассказывает он своим избирателям. Меня волнует другое. Мог ли бы кто-нибудь из них (колхозник, учитель, рабочий) имея один благоустроенный дом, устроить потом себе и своим близким вместо него две 4-комнатные квартиры?

Обещал в вопросах социальной справедливости приравнять ответственных работников и рядовых тружеников Иван Иванович, обещал.

Но ведь эти простые труженики ежедневно бьются как рыба об лед, решая свои жилищные проблемы, в том числе и вопросы прописки. У них нет доступа к обходным маневрам. Другое дело, возможности у народного депутата Республики Беларусь Ивана Авина. Говорил он высокие слова, но и себя не забыл, своя рубашка ближе к телу.

Хотел уже поставить точку, да вспомнил, что в пункте 8 предвыборной программы народный депутат Республики Беларусь Иван Авин считает своим долгом бороться против клеветы и наговора на общество, организации, конкретных людей. Пришлось обложиться со всех сторон справками и документами на случай вызова в суд. А вось Господь пронесет.

Борис ХАМАЙДА.

МАНКУРТЫЗМ

Як нам не хапае родных слоў!
«Раніцы», «рамонкаў», «прывітання»...
Мова—ёсць аснова ўсіх асноў,
а ў нас—ні «Мары», ні «Кахання»!

Не працуе ўжо паўвека Млын,
і не водзяць Вёскі Карагоды.
Не стае на вуснах «Журавін»—
і не стала ў сэрцы Асалоды.

Манкуртызм крамлёўскаю сцяной
нас адгарадзіў ад Мовы-маці.
Адракліся ад мовы мы сваёй,
як Луіс Альберта ад дзіцяці.

І жыве гаротная яна
Толькі ў кнігах ды тэлеэкранах:
б'ецца, нібы птушка ля вакна,
у якой усе крылы ў цяжкіх ранах.

Хоча зноў над моваю сапець
Манкуртызм, да абяцанак ласы.
І не можа ён уразумець:
ВОЛЯ трэба Мове, не «каўбасы»!

Анатоль КАРЧЭЎСКІ

Матэрыялы з «Выбара» ў канадскай газеце

У чарговым дадатку да канадскае газеты «Беларускі голас»—«Водгаласах» (№ 370, ліпень г.г.)—зноў надрукаваныя матэрыялы з нашага выдання: «Аб сумненнях і іх беспадстаўнасці» Ул. Слабіна (№ 7 за гэты год), «Зачацце на хлусні» Я. Мальчэўскай, «Прэм'ер застрашвае» Ул. Дубайца з сёлетняга 12-га нумара і іншыя артыкулы з «Выбара».

М. ВАЛАЧОБНІК.

ЦІ ДУМАЮЦЬ ЯНЫ АБ БУДУЧЫМ?

Мінулай восенню ў «Віцебскім рабочым» была змешчана мая заметка аб нездавальняючым стане Варонаўскага возера. Прайшоў год, але нічога не змянілася. Па-ранейшаму на беразе возера канюшня і цялятнік мясцовага саўгаса, на другім беразе—аўтастаянка. Возера патрохі ператвараецца ў балота. Ля берага—рознае ламачча, жалеззе і г. д. Рыба ў возеры яшчэ быццам ёсць (мясцовыя рыбакі нешта ловяць вудамі і на нешта спадзяюцца), але ракі ўжо зніклі, хоць раней і рыбы было больш, і ракаў шмат.

Экалагічныя праблемы цяпер абвастрыліся. Таму трэба думаць пра будучыню, пра лёс наступных пакаленняў, а не жыць эгаістычна, адным днём. Але, па ўсім бачна, менавіта так, адным днём, жыве кіраўніцтва саўгаса «Вароны» і Варонаўскага сельсавета. Таму я звяртаюся да кіраўніцтва Віцебскага райвыканкама з просьбай аб вырашэнні гэтага пытання, канкрэтна: убраць з берагоў нашага возера стайню, цялятнік, аўтастаянку, ачысціць прыбярэжную паласу ад бруду.

Анатоль БУКАЧОЎ.

Вакол культурна- рэлігійнага жыцця

Вакол культурна-рэлігійнага жыцця

Нядаўна ў віцебскім друку з'явіўся ліст камісіі па культуры Віцебскай Рады БНФ старшыні гарвыканкама М. Федарчуку з прычыны імкнення некаторых рэлігійных колаў адбудаваць на Ратушным пляцы ў Віцебску капліцу (часоўню), якая была пастаўлена з нагоды 50-ых угодкаў далучэння ўніятаў да праваслаўя. Сёння мы прапануем яшчэ адзін дакумент, які надае новую рысу гэтай праблеме.

Намесніку Старшыні Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь М. І. ДЗЕМЧУКУ

Шаноўны Міхаіл Іванавіч!

У адказ на Ваш ліст ад 29 ліпеня 1992 г. адносна мэтазгоднасці адбудовы часоўні XIX ст. у Віцебску паведамляю наступнае.

Супрацоўнікі Нацыянальнага навукова-асветнага цэнтра імя Ф. Скарыны абмеркавалі на імправізаваным сходзе пытанне аб аднаўленні ўказанай часоўні і прыйшлі да вываду, што яно няпростае. З аднаго боку, разбураныя помнікі архітэктуры, безумоўна, патрабуюць аднаўлення. З другога ж боку, і тут супрацоўнікі Цэнтра цалкам пагаджаюцца са сваімі віцебскімі калегамі, часоўня была ўзведзена як помнік прымусу над народным сумленнем з боку царскага самаўладства. Такая ацэнка ліквідацыі ўніі ў 30-х гадах XIX ст. была дадзена К. Каліноўскім («Мужыцкая праўда»), Ф. Багушэвічам («Хрэсьбіны Мацюка»), Я. Купалам і іншымі класікамі беларускай літаратуры. Таму аднаўленне часоўні толькі як помніка царскага прымусу сёння не выклікала б разумення ў грамадстве, не садзейнічала б нацыянальнай еднасці і ўзаемаразуменню паміж рознымі канфесіямі.

Супрацоўнікі Цэнтра прапанавалі адзіны рэальны выхад з сітуацыі: як своеасаблівы акт «адкуплення» гістарычнай несправядлівасці, няхай учынеінай і іншым рэжымам, перадаць часоўню пасля рэстаўрацыі (ці для рэстаўрацыі) віцебскім вернікам—уніятам.

Дырэктар Нацыянальнага навукова-асветнага цэнтра імя Ф. Скарыны, прафесар

А. МАЛЬДЗІС.



Перепечатка по просьбе читателей

ПО МИННОМУ ПОЛЮ— К «СВЕТЛОМУ ПРОШЛОМУ»

Еще совсем недавно мало кто в Витебске слыхал о рабочей производственного коврового объединения Г. П. Харитоновой. Но в последние месяцы она стала городской знаменитостью. Ее имя не сходит со страниц местных газет. Галина Павловна выступает со страстными речами на собраниях, охотно дает интервью журналистам.

О чем же говорит, к чему зовет опытная прядильщица? Это станет понятным, если сообщить, что прозвали ее витебской Ниной Андреевой. И это Галине Павловне весьма льстит. Она публично заявила, что разделяет взгляды смелой ленинградской женщины и гордится прозвищем, которое ей дали демократы.

Но не только лавры идеолога необольшевизма не дают спать Г. П. Харитоновой. Довелось услышать, как ее сравнили с самой Жанной д'Арк. Подобно бесстрашной воительнице выступила мастерица прясть пряжу в поход за спасение белорусского народа от политиков-предателей, которые действуют по указке из-за рубежа. По словам Харитоновой, стоит вопрос о существовании нации, ибо, страшно сказать, подвергается она геноциду. Но нет в республике органа, который бы защитил от него белорусов. Это обязан сделать Верховный Совет. Однако, чего можно ждать от парламентариев, если они не просто пренебрегают интересами трудящихся, но и настоящим образом попирают волю народа. Прямо наваждение какое-то. В этих условиях самое время ударить в колокола и бросить в массы мобилизующий клич—«Отечество в опасности!» Нужны конкретные, решительные действия. Прежде всего предстоит консолидировать людей, оппозиционно настроенных по отношению к нынешним властям. Г. Харитонова сколачивает из своих единомышленников инициативную группу, которая приступает к подготовке городского собрания рабочих. Два с половиной месяца назад оно состоялось в клубе завода имени Кирова.

Собралось людей меньше, чем работает лишь в одном цеху этого предприятия. В своем выступлении Г. Харитонова говорила о том, что рабочие, пока не поздно, должны без колебаний взять судьбу в свои руки.

Собравшиеся избрали членов координационного совета во главе с Харитоновой. Первым пунктом в программе действий этого совета значилось проведение представительной городской конференции представителей трудовых коллективов, на которой бы было сказано решительное «нет» антинародной политике властей.

Харитонова и ее сподвижники развернули кипучую деятельность. Они трубили о том, что грядет поистине массовый форум, который явится крупнейшим событием в общественно-политической жизни Витебска. По всему городу были развешаны отпечатанные типографским способом листовки, которые сообщали о предстоящей конференции, ее целях. Рекламу им составили публикации в газете «Віцебскі рабочы», из которых явствовало, что некоторые официальные структуры, например, Совет областного объединения профсоюзов, поддерживают проведение конференции.

Но, несмотря на продолжительную и шумную агитационно-пропагандистскую кампанию, «форум» явно не удался. Собралось чуть более 600 человек. Но среди них было мало рабочих. Зато без приглашения явились идейные противники организаторов конференции. А в их планы не входило устраивать полемику. Сценарием не предусматривалось предоставление слова инакомыслящим. Это привело к конфликту.

А поначалу все шло гладко. Звучали гневные речи о жидомасонском заговоре, о бесправии трудящихся при власти демократов, о распродаже народного добра нововявленным миллионерам и далее в таком же духе. После того, как выступили 8 заранее определенных ораторов, каждому из которых регламентом было отведено пять минут, поступило предложение прекратить прения. Горячо поддержанное президиумом, оно было принято. Вопреки протесту группы присутствующих. Нескольким чуть ли не с боем пришлось прорываться к микрофону.

Попытка зажать на конференции рот тем, кто имеет свое собственное мнение по обсуждающимся вопросам, привела к тому, что значительная часть собравшихся в знак протеста демонстративно покинула зал. Г. Харитонова расценила это как провокацию, устроенную бээнэфовцами. Но ведь даже из президиума ретировались несколько человек, когда по ходу обсуждения они поняли суть происходящего.

А их в принадлежности к БНФ никак не заподозришь. Тем не менее конференция с помпой приняла документы. Среди них, пожалуй, главный—обращение к депутатам Верховного Совета Республики Беларусь.

Не только из-за описанного выше инцидента конференция приобрела скандальную известность. Конфуз ждал организаторов уже после её проведения. От нее официально отмежевался Совет областного объединения профсоюзов. Затем председатели профкомов крупнейших предприятий города обратились в редакции газет с письмом, в котором говорится, что никаких выборов делегатов на конференцию не проводилось и никто не уполномачивал присутствовавших на этом собрании представлять их коллективы.

Тем не менее Г. П. Харитонова и ее сподвижники по координационному совету, избранному самозванной «конференцией», не устают утверждать, что они выступают от имени рабочего движения города.

Но если это так, если они выражают волю рабочих, защищают их интересы, почему же те остаются глухими к их лозунгам и призывам? Ведь среди голосовавших за принятие документов конференции большинство составили пенсионеры.

—Происходит это потому,—объяснила Галина Павловна,—что крепок в головах людей стереотип, ежедневно вбиваемый им демократической печатью и антинародными, не побоюсь этого слова, телевидением и радио.

Невдомек Галине Павловне, что сама она наглядно демонстрирует свою приверженность к стереотипам, заимствованным у защитников «ума, чести и совести эпохи», те поднаторели в создании образа врага. Вот и Харитонова пытается объяснить происками демократов свои неудачи в политической деятельности.

Сразу оговоримся, что слово политикан—не подходит для характеристики Харитоновой. Она человек искренний, и движет ею стремление как-то облегчить участь людей, пожинающих горькие плоды перестройки. Ведь это факт, что на народ обрушились большие бедствия. В экономике—хаос. Цены озверели. С каждым днем все больше людей оказываются за чертой бедности. Растут ряды безработных. Галина Павловна недоумевает, почему в этих условиях большинство населения, терпеливо снося все лишения, не поднимается на борьбу за свои попранные права. Она и ее сподвижники пытаются открыть людям глаза, встряхнуть их. Но их усилия оказываются тщетными.

Так, например, «конференция» поручила координационному совету провести в трудовых коллективах собрания по обсуждению принятых на ней документов. Но ни одного собрания в течение месяца провести не удалось. Казалось бы, людям уже стало жить невмоготу. Но попытки сыграть на их недовольстве пока оканчиваются провалом. Почему? Вот как ответил на этот вопрос председатель профкома арендного предприятия «Витебские заточные станки» Евгений Леонидович Белогузов.

—Людям наскучили митинговые баталии. Они устали от политики. Но первопричина равнодушия к лозунгам и призывам «радетелей за пролетариат» в другом. Как бы худо ни было сейчас, в своем большинстве трудящиеся против возврата к порядкам, которые существовали у нас при тоталитарном режиме. Чего не хотят понять Харитонова и ее соратники. Находясь в плену иллюзий, они выдвигают оторванные от реалий сегодняшнего дня требования. Об этом и хотел я сказать на так называемой конференции. Но меня не подпускали к микрофону. Видимо, считая, что будучи представителем арендного предприятия, я—сторонник реформ.

Что ж, это действительно так. Хорошо зная настроения рабочих, могу сказать, что надежды на лучшую долю они связывают с ускорением реформ. А положение становится все более угрожающим, потому что они буксуют. Есть в этим вина Верховного Совета, который непростительно затянул принятие важнейшего из законов, определяющих переход к рынку,—о приватизации. Мы движемся вперед, как говорится, робким зигзагом. Можно и нужно критиковать парламентариев, исполнительную власть. Только не с тех позиций, с каких это делают консерваторы, в том числе и такие добросовестно заблуждающиеся, как Харитонова.

С мнением Евгения Леонидовича нельзя не согласиться. Наше общество серьезно больно. Но рецепты, которые предлагают эти люди, претендующие на роль лидеров городского рабочего движения, его не вылечат, а способны лишь загнать болезнь вглубь. Впрочем, ничего конструктивного они не предлагают. Они смотрят не вперед, а назад, и видят свою цель лишь в том, чтобы ставить палки в колеса нарождающихся рыночных отношений. Отсюда те требования, которые содержат обращение к народным депутатам: не допустить разгосударствления и приватизации, гарантировать полную занятость, ввести монополию государства на внешнюю торговлю и прочее.

По этому поводу Е. Белогузов высказал предположение, что кто-то из «бывших» стоит за спиной организаторов «конференции», подбрасывает им свои идейки, пытается манипулировать рабочим движением.

А вот П. Владимиров догадки не строит. В отчете под названием «Собрание рабочих или пленум горкома ПКБ?», опубликованном в газете «Выбар», он утверждает, что подготовку конференции осуществлял не «мифический» оргкомитет рабочих, а недавно созданный горком партии коммунистов Беларуси с помощью некоторых профсоюзных руководителей, что «президиум, редакционная комиссия, почти все выступающие были от них».

Так то или нет—не знаю. Но во время беседы с Галиной Павловной было ощущение, будто она говорит с чужого голоса.

—Выполнение ваших требований означало бы восстановление административно-командной системы, отказ от рыночных отношений. Ведь так?—спросил я ее.

—Правильно,—с готовностью ответила она.—Мы сторонники плановой экономики, социалистического выбора, непримиримые противники капитализации и не склоним голову перед новыми эксплуататорами, нещадно грабящими народ.

Знакомые перепевы. Невольно вспомнилась полоса в прошлогоднем номере газеты «Віцебскі рабочы» под названием «Исповедь». В ней журналист Леонид Саратокин излил свою жгучую тоску по застойным временам и на все лады бичевал эту самую капитализацию. Газета ««Знамя юности» опубликовала статью «Отповедь «Исповеди», в которой развенчала его «классовые оценки» того, что происходит в нашей жизни. С той поры Леонид Саратокин не столь откровенно зовет нас в «светлое коммунистическое прошлое». Внес он коррективы в методы пропаганды своих идей. Так, появилось в номере газеты «Віцебскі рабочы» за 21 июля пространное интервью Л. Саратокина с Г. Харитоновой как с председателем координационного совета рабочих. Нет ничего удивительного, что проявляют они полное единодушие во взглядах. Как говорится, дуют в одну дуду. А скорей всего, бывший заведующий идеологическим отделом Октябрьского райкома КПБ вложил в уста Галины Павлоны свои мысли, например, о том, что народ подвергается геноциду. А взять перл об угнетении народа нововявленными политиками и послушными им исполнительными властями! При этом собеседники тщатся представить дело так, будто в интервью отражены мнения большинства трудящихся, интересы которых просто некому больше защищать. Между строк можно прочитать: мол, такая обстановка сложилась потому, что была запрещена деятельность КПБ.

Трудно удержаться, чтобы не привести следующие слова из опубликованной на той же полосе статьи Алеся Мудриченко: «Только коммунистам-большевикам принадлежит исторически выработанный демагогический прием говорить от имени «всех угнетенных и забитых» трудящихся и гнать перед собой по минному полю политической борьбы люмпензаложников». Так сказано о «конференции» рабочих города. Но в еще большей степени это относится к указанному интервью, авторы которого хотели бы увлечь как можно больше людей на «минное поле» революционной борьбы за реставрацию «развитого социализма».

Леонид ВИНОКУРОВ.

(«Знамя юности» № 93 от 7.08.1992 года).

НАВІНЫ

У амерыканскім часопісе «Полацак» (№ 5 за г. г.) надрукаваны ў рубрыцы «Кола жыцьця Бацькаўшчыны» матэрыялы аб Віцебшчыне нашага карэспандэнта Ю. Сцяпанава.

* * *

Напрыканцы ліпеня выканкамам (пасведчанне № 89) Віцебскага абласвета зарэгістравана грэка-каталіцкая абшчына места Віцебска.

* * *

БСДГ заснавала чарговае выданне—унутрыпартыйны інфарматар-месячнік «Навіны Грамады». Акрамя яго, у партыі ўжо ёсць рэспубліканская газета «Грамада», «Менскі веснік» і пастаўскае «Сумежжа». Тэлефоны новага інфарматара ў Менску: 46-46-91, 46-43-15.

Ю. ТУТЭЙШЫ.

МОЖНО ЛИ СТАВИТЬ ТОЧКУ?

С момента опубликования моей статьи «Погиб или!..» («Советский патриот», 1991, № 43) появились три публикации, в различной степени относящиеся к трагической судьбе Петра Машерова. Среди них выделяется статья белорусского журналиста Славомира Антоновича «Накануне трагедии. Петр Машеров» (минская газета «Набат», № 1—6, 1992 г.). Этот развернутый очерк содержит некоторые немаловажные данные и свидетельства, ранее не являвшиеся достоянием печатного слова. В этом аспекте с ним перекликается статья Николая Матуковского «Последний день Петра Машерова» («Известия», 2 марта 1992 г., № 52). Статья Станислава Аслезова «Пришелец из будущего» («Патриот», № 3—7, 1992 г.) по времени появилась в промежутке между называемыми публикациями. Согласно редакционной преамбуле, написана она как отклик на мою статью.

Создавая угодный ему облик славного сына белорусского народа, Аслезов ставит вопрос: «Был ли Машеров оппозиционером?» Ответ весьма своеобразный: «Кто лучше ответит на этот, безусловно, главный вопрос, как не бывший начальник охраны Петра Мироновича? Валентин Сазонов—полковник в отставке, в прошлом сотрудник КГБ...—«Подобные утверждения более, чем сомнительны... Машеров—оппозиционер? Смешно! Наоборот, его отношения с руководством партии и страны были добрыми, ему симпатизировали. Да и Брежнев его уважал...» (разрядка моя—В. Б.).

Кто лучше знает, чем охранник? Ответ, конечно, интересный... Как жаль, что историческая наука раньше не шла этим простым-простым путем!

Аслезов, желая быть приятным «и нашим, и вашим», заявляет вдруг нечто совершенно неожиданное: «Если анализировать причины гибели Машерова, то он, как мне кажется, скорее—жертва системы, нежели предвзятого отношения к нему Леонида Ильича».

